# «ПАРУСІЯ»



*Парусія – з грэцкай мовы – Другое прыйсце Гасподняе, якое павінна адбыцца пры сканчэнні веку, калі князь гэтага свету раптоўна набудзе вялікую моц і статус, так што ніхто не зможа без яго загаду ці кляйна: «ні купляць, ні прадаваць» [Адкр 13, 18]. Нават многія верныя будуць пераможаныя гэтым злом, упэўненыя ў Антыхрысце як у божым сыне.

**• Рубрыку вядзе святар Яўген Маліноўскі, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт**

*Держава могучая, духом сильна*
*Достаточно хлеба и злата,*
*Правителем мудрым свободна страна,*
*Людьми и делами богата.*
*С границ отдаленных к нам враг не придет,*
*Кочевник косматый не страшен,*
*И жизнь, как спокойная речка, течет*
*В краю замечательном нашем.*
*Прекрасным цветком распустился дворец,*
*Что строит народ кропотливо,*
*Чуть выше – и в небо упрется венец,*
*Богам и соседям на диво.*
*Раскинулись вширь города и сады,*
*Селенья и тучные пашни,*
*И к счастью пути очень ясно видны*
*С высот Вавилонской той башни.*

*С. Езерский*

Вавілонская вежа – гэта, на мой погляд, сучасная віртуальная тэлерэчаіснасць, распавяданая праз вядомы анекдот, персанаж якога тэрмінова пажадаў трапіць менавіта ў тую Беларусь, што на тэлеэкране. Сапраўды, «из всех искусств важнейшим для нас является кино» (В.И. Ленин). Гэта асабліва датычыцца таго абывацеля, які трапна пераключае ўсе чатыры каналы палітычнай валтузні і эратычнай мільгатні ў пошуку эстэтычнага ўражання ад выпадковага словаздарэння. Так, чарговая слэнгавая амбіцыя кіраўніка краіны «мы сделали эту страну» па выпадковасці, як не абазнанай заканамернасці, у той жа дзень была падмацавана амерыканскай кінастужкай «Насельніцтва 436» на тэлеканале Intex.

Фабула карціны змяшчае ў сабе жыццё і смерць горада, насельніцтва якога ўжо доўгі тэрмін не перавышае лічбы «436» як паказчыка «стабильности и процветания». Кожны новы жыхар горада выпрабоўваецца яго ўрадам на наяўнасць «ліхарадкі», гэта значыць іншадумства. Дыягностыка «хваробы» высвечвае індывідуальныя хібы чалавека, жадаючага застаецца саматоесным, валодаць асабістымі думкамі і пачуццямі, не падпадаючы пад чужое ярмо. Кожны такі «ліхарадачны» метадычна праходзіў рэлігійна-ідэалагічную апрацоўку. Той, хто паддаваўся лячэнню, уваходзіў у адзначаную лічбу замест, па-нашаму кажучы, «отморозка», хварэючага на спрэчныя думкі і сардэчныя пачуцці, таму патрабуючага калектыўнага ўмяшальніцтва аж да фізічнага знішчэння. Удзячнае насельніцтва-436 натхнёна ўсхваляла бога за тое, што даў гораду мудрых правіцеляў і сытае жыццё. Толькі дробязь дасаджала рахманай плыні жыцця – душэўны непакой у выглядзе снабачанняў і слэнгавых агаворак. Зразумеўшы, што гэта тая цана, якую плоцяць людзі за знешні дабрабыт, герой кінастужкі паспрабаваў вывесці з цывілізацыі смерці каханую жанчыну і яе дачку. Тая ж, тэрмінова замбіраваная электрашокатэрапіяй, ветліва-раўнадушна прывітала ўцекача: «Как жалко, что ты не был на обеде». Сытны абед і каляровае відовішча – вось маўклівы дабрабыт рэспублікі-мроі. Урэшце фільм заканчваецца трагічна: герой разам з дзіцем гіне ад прадстаўнікоў мроепарадку. Такім чынам аўтар ілюструе вызначэнне асабістай вартасці ў смяротнай навале сектанцкага змроку. Як тут не ўзгадаць першасвятарскае прароцтва: «кожны, забіваючы вас, будзе думаць, што тым самым ён служыць Богу»[Ян 16, 2].

Сёння пад жупелам «стабильности и процветания» пакутлівае сэрца беларуса як нацягнутая струна пужліва рэагуе на праявы псіхічнай рэальнасці, у тым ліку ўласныя агаворкі. Апошнія, згодна з псіхааналізам З. Фрэйда, служаць праявай выцяснення, такога своеасаблівага ахоўнага механізму ўтрымання непрыемлемых думкаў і трывожных прадчуванняў па-за сферай свядомасці, які маскіруе жадаемае пад рэчаіснае. Але выцясненне ніколі не бывае поўным, таму вельмі часта стрымания пабуджэнні прабіваюцца на паверхню ў выглядзе ўскосных інверсій (ironій, падтэкстаў) альбо незнарокавых агаворак, як ужо непасрэднай індэксацыі рэчаіснасці. Напрыклад, той адмысловы тэлевізійны дзень быў ўзбагачаны яшчэ адным перлам з вуснаў дыктаршы навін на Першым нацыянальным. Замест выразу «внешне-политическая стратегия государства» яна падсвядома спраектавала: «внешне-политическая трагедия государства». У такі спосаб агаворка трагікамічна адлюстравала новы таямніча-палітычны «принцип мудрецов».

Спантанныя агаворкі і сакральныя праекцыі, якія штучна маскіруюцца пад грамадскія і рэлігійныя каштоўнасці – традыцыйная спадчына дыктату. І яны, практычна ўсе, класіфікаваны псіхааналізам. Так, патрыятычныя прымхі накшталт «Белорусы – самая мудрая нацыя» кваліфікуюцца як праекцыя падсвядома шавіністычнага ранжыравання (построения) іншых, не падазраючых аб сваёй «немудрёности» нацый. Паводле гэтага ж метаду, надакучлівы лозунг «мой город – моя любовь» гучыць як прымітыўная сублімацыя лібіда (узнясенне палавога інстынкту) да правінцыяльнага матыву комплексу непаўнавартасці: як няма ў каго закахацца, дык мусіш любіць хаця б тыя ж Баранавічы.

Рызыкуючы трапіць пад выкрывальныя рэплікі патрыётаў, псіхааналіз выяўляе наступны самаахоўны механізм – рацыяналізацыю, якая дазваляе падсвядома выпрацоўваць самаапраўдальнае тлумачэнне, пад якім схаваны рэальныя матывы дзеяў. Напрыклад, калі не ладзіцца сацыяльна-эканамічнае жыццё дзяржавы, знаходзіцца рацыянальнае апраўданне ў словах: «посмотрите, что делается на Украине». Відавочна, што такая рацыяналізацыя, небяспечная пыхлівасцю і зларадствам, выяўляе падсвядомую непрымальнасць менталітэту, годнага жаданнем «людзьмі звацца»(Я. Купала). Урэшце непрымальныя пошасці заўзятага зларадцы сублімiруюцца ў палітычную дзейнасць як кампенсацыю духоўнага недахопу. Псіхолаг А. Адлер лічыў, што матывам такіх паводзін часта з'яўляецца намаганне пераадолець дзіцячае пачуццё непаўнавартасці, якое вынікае з імкнення да перавагі і ўлады. Незаконназачаты сын служанкі-пакаёўкі і яе гаспадара, Адольф Гітлер спрычыніўся законнаму нараджэнню праз іх шлюб, які адбыўся адразу ж пасля смерці першай жонкі яго бацькі, гера Шыкльгрубера. Аб чым марылі палюбоўнікі ў пералюбным запале побач са смяротным ложкам, можна толькі здагадвацца. Але відавочным наступствам іх гвалтоўнага жадання хутчэйшай смерці жонцы і гаспадыні з'явілася некрафілія (любоў да смерці) Гітлера, аб якой разважае ў сваім навуковым трактаце псіхааналітык Э. Фром.

Іншы навукоўца К. Юнг лічыў, што ў падсвядомасці ўтрымліваюцца не толькі прытоеныя думкі і пачуцці асобнага чалавека. Існуе таксама калектыўная падсвядомасць альбо архетыпы – сховішча вобразаў, даходзячых з мінулых часоў як агульны досвед продкаў. Ен сцвярджае, што архетыпы дазваляюць зразумець, чаму для развіцця культуры зыходнымі з'яўляюцца духоўныя чыннікі і чаму розныя народы непазбежна мінаюць міфы і штучныя вобразы, падобныя да «белого царя» альбо «бацькі», «Невидимого града Китежа» альбо «Вавилонской башни коммунизма». Сімвалы, прыдбаныя ў лічбах, артэфактах і шэдэўрах мастацтва, нясуць сабой псіхалагічную інфармацыю аб нас саміх як уласцівых міфатворчасці, у тым ліку віртуальнай тэлерэчаіснасці. Каб мінуць міфы і агаворкі ва ўласным жыцці, кожная асоба робіць рашучы выбар паміж «сделанной ими страной» дзеля «собственного имени»[Быц 11, 4] і «Богам створаным народам, які ў свой час праславіць Яго Імя»[Пс 85, 9].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ